# ФАРМІРАВАННЕ Ў МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ЦІКАВАСЦІ ДА ЧЫТАННЯ

*Шахалевіч Кацярына Аляксандраўна*

УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

У псіхолага-педагагічнай літаратуры чытацкая цікавасць у вузкім сэнсе слова разумеецца як жаданне і патрэбнасць узнаўлення сэнсу чужога маўлення па яго пісьмовай форме: цікавасць да механізму прачытвання, да пераводу надрукаваных знакаў у гукі і асэнсаванне гукавых комплексаў. Такая цікавасць характэрна для дзіцяці, якое, разгарнуўшы «Буквар» ці глянуўшы на кнігу, вельмі хоча зразумець сэнс надрукаваных там слоў, а таксама для першакласніка, які толькі навучыўся працэсу раскадзіравання асобных слоў ці простых сказаў і якому хочацца прадэманстраваць сваё ўменне яшчэ раз. У шырокім сэнсе слова чытацкая цікавасць заключаецца ў актыўных адносінах чытача да чалавечага вопыту, заключанага ў кнігах, і да сваёй здольнасці самастойна здабываць гэты вопыт з кніг. Пры гэтым абавязковае праяўленне чытачом разумовай і эмацыянальнай актыўнасці, каб мэтанакіравана арыентавацца ў кніжным акружэнні, у кнізе як інструменце для чытання, у тэксце як асноўным кампаненце кнігі, які захоўвае і перадае чытачу гэты вопыт пры ўмове кваліфікаванага прачытання тэксту [1].

Мэтанакіравана працаваць з кнігамі дзіця пачынае ў пачатковай школе. Менавіта на гэтым этапе важна далучыць малодшага школьніка да чытання, развіваць яго чытацкую цікавасць, так як менавіта ў гэты перыяд закладваюцца асноўныя чытацкія ўменні і навыкі. Вучэбна-метадычная літаратура прапануе разнастайныя методыкі, якія спрыяюць павышэнню тэхнікі чытання вучняў, аднак у літаратуры цяжка знайсці цэласны набор сродкаў, метадаў і прыёмаў, сукупнасць якіх дазволіць сфарміраваць у вучняў цікавасць да чытання.

Паказчыкамі чытацкай цікавасці малодшых школьнікаў з'яўляюцца:

– станоўчае стаўленне да самой чытацкай дзейнасці («люблю чытаць»);

– зацікаўленасць канкрэтнымі кнігамі («хачу гэтыя кнігі»);

– захапленне самім працэсам чытання («не магу адарвацца ад кнігі»);

– імкненне падзяліцца з іншымі радасцю ад зносін з кнігай («хачу, каб іншыя аб гэтай кнізе даведаліся»).

Прасочваюцца наступныя этапы фарміравання чытацкай цікавасці:

– 6–7 гадоў, калі цікавасць да любой кнігі звязана ў дзяцей з жаданнем і ўменнем дзейнічаць самастойна. У гэты час дзецям цікавыя і вершы, і казкі, і

апавяданні, але вершы і казкі ім чытаць значна лягчэй, чым апавяданні, а так называемыя «тонкія» кнігі («малюткі») ім падабаюцца больш, чым «тоўстыя».

– 8–9 гадоў, калі вучні асабліва захапляюцца кнігамі аб прыродзе. Гэта выклікана тым, што дзеці хочуць хутчэй выступіць у ролі дарослых, а свет прыроды – гэта тая сфера жыцця, дзе дзіця 8–9 гадоў адчувае сябе свабодна. Кнігі аб жывёлах і раслінах захапляюць вучня тым, што дапамагаюць яму пазнаць гэты свет, а таксама зразумець, як у ім можна і трэба дзейнічаць.

– 9–10 гадоў, калі ўласціва цікавасць да свету людзей, да гістарычных падзей, да асоб, да прыгод і падарожжаў і асабліва – да казачных і фантастычных.

Схему працы па фарміраванні цікавасці да чытання малодшых школьнікаў можна паказаць у выглядзе схемы: урок літаратурнага чытання; пазакласныя заняткі; сумесная праца з бібліятэкай; праца з бацькамі.

Урокі літаратурнага чытання павінны развіваць у школьнікаў цікавасць да кнігі і любоў да чытання, а таксама прывіваць ім карысныя веды, уменні, навыкі. Сёння існуе два напрамкі навучання чытанню дзяцей малодшага школьнага ўзросту: фарміраванне чытача і далучэнне да літаратуры як асобага віду мастацтва. Менавіта настаўнік здольны сінтэзаваць гэтыя накірункі пры арганізацыі ўрокаў літаратурнага чытання. Творчым чытаннем рухае дапытлівасць. Прызначэнне працы настаўніка – спрыяць перарастанню цікаўнасці ў дапытлівасць, дапамагаць чытачу не спыняцца на запамінанні фактаў, а шукаць іх абумоўленасць, прычыннасць. Такім чынам, паступова фарміруецца звычка і навык удумлівага чытання і граматнага чытача. Вялікую эфектыўнасць маюць нестандартныя ўрокі: гульня-падарожжа, урок-казка і інш.

Розныя віды работ над тэкстам спрыяюць развіццю цікавасці да чытання, а таксама фарміраванню навыкаў выразнага чытання. Напрыклад, інсцэніраванне тэксту або ўрыўка, выбарачнае чытанне, чытанне па асобах, чытанне ланцужком па сказе, чытанне ланцужком па абзацах, чытанне з мэтай знаходжання ўрыўка да адпаведнага малюнка, чытанне з мэтай знаходжання ўрыўка, які дапаможа адказаць на пытанне і г. д.

Асаблівасцямі фарміравання чытацкай цікавасці ў пачатковай школе служаць таксама такія рысы, як цікавасць да ўсяго новага (аб’ектаў, людзей, падзей), цікаўнасць, дапытлівасць, праз якія можа і павінна ажыццяўляцца развіццё чытацкай цікавасці. Дарослыя (педагогі, бацькі) павінны навучыць дзіця выбіраць такія кнігі, якія будуць не проста забаўляльным чытаннем, але дапамогуць перажыць эмоцыі больш высокага ўзроўню, калі школьнік будзе суадносіць сябе з героямі кніг, параўноўваць сябе з імі, аддзяляць сябе ад іх,

вучыцца адрозніваць дрэннае ад добрага і такім чынам выхоўваць у сабе асобу.

Роля сям'і ў фарміраванні адносін да кнігі, чытання таксама надзвычай вялікая. Калі дарослыя члены сям'і чытаюць, дзіця гэта бачыць. Уражанні, атрыманыя ў сям'і, застаюцца нейкім маштабам для параўнання, для ацэнкі на ўсё жыццё і рэалізуюцца ўжо ва ўласнай сям'і. Склад хатняй бібліятэкі, якая адлюстроўвае густ, род прафесійных заняткаў і аматарскіх інтарэсаў часам некалькіх пакаленняў, шмат у чым вызначае не толькі стаўленне да кнігі, але і кола чытання дзіцяці. Праблема заключаецца ў тым, што значная частка насельніцтва не чытае, і толькі 30% бацькоў ведаюць, што чытаюць іх дзеці [2].

Сцвярджэнні аб «крызісе дзіцячага чытання» далёка не выпадковыя і маюць пад сабой рэальную аснову. Многія сучасныя метадысты сцвярджаюць, што ў пачатку XXI стагоддзя дзеці чытаюць «не тое» і «не так», як папярэднія пакаленні. Але яны, безумоўна, чытаюць. У той жа час ідзе працэс трансфармацыі, карэннай змены чытацкіх звычак юных чытачоў. Так, Я.Л. Грашчакова мяркуе, што мяняюцца практычна ўсе характарыстыкі дзіцячага чытання: статус чытання, яго працягласць, характар, спосаб працы з друкаваным тэкстам, кола чытання дзяцей і падлеткаў, матывы і стымулы чытання, якім творам аддаюць перавагу і інш. [2].

Спецыфіка дзіцячай чытацкай групы заключаецца менавіта ў тым, што кніга патрэбна ім «тут і цяпер», дзеці не могуць, як дарослыя, адкласці на потым свае нерэалізаваныя патрэбнасці, яны проста пераключаюцца на іншыя сродкі камунікацыі і спосабы правядзення вольнага часу.

У малодшым школьным узросце ідзе надзвычай хуткае развіццё эмацыянальнай сферы, так званага пачуццёвага інтэлекту. Звяртаючы вялікую ўвагу на гэтую асаблівасць малодшага школьнага ўзросту, настаўнік можа дасягнуць высокай эфектыўнасці ў сваёй працы па фарміраванні цікавасці да чытання.

На базе станоўчых эмацыйных перажыванняў з'яўляюцца і замацоўваюцца патрэбнасці і цікавасці чалавека. Менавіта ў малодшым школьным узросце адбываецца назапашванне пачуццяў і перажыванняў. Таму малодшыя школьнікі шукаюць у чытанні:

– займальнасць, моцныя эмацыянальныя перажыванні. Іх уяўленне захопліваюць вострасюжэтныя творы, гераічныя подзвігі здаюцца нормай жыцця;

– для дзяцей малодшага школьнага ўзросту патрэбны творы, якія вучаць іх здзіўляцца. Здольнасць здзівіцца падзеі, з'яве, чалавеку для дзіцяці вельмі

неабходна: са здзіўлення нараджаецца цікавасць да жыцця, прага пазнання, уменне бачыць прыгожае і шанаваць яго [3].

Пры падрыхтоўцы да ўрока літаратурнага чытання настаўніку патрэбна ўлічваць наступныя асаблівасці вучняў малодшага школьнага ўзросту:

1. Маленькі чытач рэагуе на тэкст у першую чаргу эмацыянальна. Дзіцячыя перажыванні, звязаныя з тэкстам, – вялікая каштоўнасць для пачатковай школы. Пра важнасць для дзіцяці здольнасці адчуваць, перажываць пісалася многа раз. Успомнім вядомыя словы В. Г. Бялінскага, які лічыў, што галоўнае ў працэсе чытання, каб дзеці як моага «больш адчувалі»: «Няхай паэзія слова дзейнічае на іх, як музыка, прама праз сэрца, міма галавы, для якой яшчэ прыйдзе свой час» [4].

2. Другая асаблівасць дзяцей малодшага школьнага ўзросту – атаясамліванне мастацкага свету і рэальнага. Невыпадкова гэты перыяд у развіцці чытача называюць узростам «наіўнага рэалізму». Гэта выражаецца ў адносінах да персанажа як да жывога, рэальнага; у праяўленні даверлівасці да яго адлюстравання. Думаючы канкрэтна, дзеці пастаянна пытаюць «А гэта на самай справе адбывалася?»

3. Неабходна адзначыць наяўнасць у малодшых школьнікаў чуйнасці да слова і да мастацкай дэталі. Дзіця рэагуе часам на такія псіхалагічныя тонкасці, якія дарослыя парой не заўважаюць.

4. Уласцівы малодшым школьнікам так называемы эфект прысутнасці, які азначае здольнасць дзіцяці жыць у вобразе.

5. Адсутнасць рэакцыі на мастацкую форму.

У мастацкім творы дзеці перш за ўсё бачаць герояў, сюжэт, асобныя падзеі, але не вычытваюць у тэксце аўтара, не знаходзяць пакінутыя ім «вехі», не ўступаюць з ім у дыялог. Эпітэты, знакі прыпынку, падзел на абзацы – нічога гэтага дзіця само не заўважае, а значыць, прапускае міма аўтарскія «вехі», без асэнсавання якіх не можа быць разумення.

Гэтыя якасці ўспрымання малодшых школьнікаў і з’яўляюцца для настаўніка апорай у працэсе фарміравання ў іх цікавасці да літаратурнага твора, а значыць, і да ўрокаў літаратурнага чытання.

На ўроках ліаратурнага чытання неабходна паказваць вучням, што чытанне – гэта зносіны, дыялог чытача і аўтара. Але гэтыя зносіны не непасрэдныя, а праз створаны аўтарам тэкст.

Калі настаўнік будзе прытрымлівацца той установкі, што ў мастацкім творы важна не толькі тое, што напісана, але і як напісана, з дапамогай якіх сродкаў, то дзеці абавязкова будуць звяртаць увагу на мастацкую форму твора, якая больш важная ў мастацкім маўленні, чым у звычайных зносінах. Наяўнасць такой асаблівасці ўспрымання малодшых школьнікаў як

эмацыянальны водгук на твор з’яўляецца асновай узнікнення цікавага працэсу – працэсу сатворчасці пісьменніка і чытача.

Такім чынам, вырашальную ролю ў фарміраванні чытацкай цікавасці малодшых школьнікаў адыграе максімальная апора на чытацкую актыўнасць вучняў, а таксама на эмацыянальную атмасферу навучання, станоўчы эмацыянальны настрой і спрыяльны псіхалагічны клімат.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Светловская, Н. Н. Методика внеклассного чтения / Н. Н. Светловская. – М. : Просвещение, 1991. – 207 с.
2. Алексеева, М. Ю. Измерители качества обучения по литературному чтению. 3 класс / М. Ю. Алексеева, Е. И. Матвеева. – М., 2013. – 96 с.
3. Ванюшева, Н. Растим читателей (к вопросу о детском чтении) / Н. Ванюшева // Литература (Первое сентября). – 2007. – № 20. – С. 25–27.
4. Белинский, В. Г. Полное собрание сочинений ; в 13 т. Т.4. – М. : Художественная литература, 1976.